**Страленя Ганна Анатольеўна**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# ДЗЕЙНАСЦЬ ЗЕМСКІХ НАЧАЛЬНІКАЎ ПА ПРАДУХІЛЕННЮ САЦЫЯЛЬНЫХ КАНФЛІКТАЎ НАПЯРЭДАДНІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

У Расійскай імперыі пасля 1861 г. неаднаразова прымаліся спробы рэфармавання сістэмы мясцовага кіравання. Асаблівую ўвагу выклікала сялянскае пытанне, якое патрабавала больш эфектыўнага вырашэння шматлікіх канфліктных сітуацый. Неадкладнасць яго рашэння дала штуршок да з'яўлення розных праектаў па рэфармаванні сістэмы мясцовага кіравання. Канчатковы варыянт рэформы быў афармлены ў «Палажэнні аб земскіх участковых начальніках», якое было прынята 12 ліпеня 1889 г. [1, с. 508–535]. Рэформа закранула не толькі адміністрацыйную, але і судовую сістэму Расійскай імперыі. Аднак асноўным звяном у яе правядзенні стала ўвядзенне пасады земскіх начальнікаў. Адным з асноўных напрамкаў іх дзейнасці было рэгуляванне сялянскага самакіравання і пазямельных спрэчак.

Пачатак Першай сусветнай вайны выклікаў змены ў дзейнасці земскіх начальнікаў. Былі пашыраны іх паўнамоцтвы, звязаныя з аказаннем дапамогі пацярпелым ад вайны. Яны тычыліся прызначэння пенсій ніжнім воінскіх чынам, якія страцілі працаздольнасць падчас ваеннай службы, дапамогі бежанцам, забеспячэння добраўпарадкавання сялянскага побыту ва ўмовах ваеннага часу, эвакуацыі мірнага насельніцтва і захавання іх маёмасці. Важным аспектам у дзейнасці земскіх начальнікаў напярэдадні і ў перыяд Першай сусветнай вайны таксама з’яўлялася эфектыўнае вырашэнне канфліктных сітуацый у вёсцы. У гэтай сувязі, асаблівае значэнне мела больш хуткае вырашэнне імі разных судовых спраў і пазямельных скаргаў. Справы, якія яны разглядалі, прадстаўлялі дастаткова шырокі і разнастайны комплекс. Большая частка як грамадзянскіх, так і крымінальных спраў ўзнікала ў выніку пазямельных і маёмасных канфліктаў паміж сялянамі і памешчыкамі. Іх ўзнікненне было абумоўлена ўмовамі адмены прыгоннага права. Сярод сялянскага насельніцтва востра стаяла пытанне аб недахопе ворнай зямлі, сенажацяў і лясных угоддзяў. На практыцы самымі шматлікімі з іх былі справы аб высечцы лесу, выпасу жывёлы на чужых угоддзях і нанясенні шкоды маёмасці. Канфліктныя сітуацыі паміж памешчыкамі і сялянамі з'яўляліся своеасаблівым маркерам сацыяльнай напружанасці ў вёсцы. У гэтай сітуацыі земскія начальнікі ў якасці суддзі-адміністратара павінны былі ўрэгуляваць адносіны паміж імі і захаваць сацыяльны спакой у сельскай мясцовасці. Да прыкладу, паверааны ўладальніцы маёнтка Свіслач. Б. Ласіцкі звярнуўся са скаргай да земскага начальніка 3-га ўчастка Бабруйскага павета. Ён настойваў, што селянін мястэчка Свіслач Н.І. Шэўчык у снежні 1911 г. самавольна высек у лесе маркізы два сухія ясені і прасіў спагнаць з яго матэрыяльную кампенсацыю [7, арк. 1–2]. На судовым паседжанні 25 жніўня 1912 г. бакі па прапанове земскага начальніка прыйшлі да міравога пагаднення, па ўмовах якога селянін абавязваўся выплаціць 2 руб. 25 кап. або адпрацаваць гэтую суму.

Яшчэ адной шматлікай катэгорыяй спраў, з якой даводзілася сутыкацца ў практычнай дзейнасці земскім начальнікам, сталі разборы скаргаў аб абразе асобы словамі і дзеяннямі, у тым ліку нанясенне цялеснай шкоды. Напрыклад, земскі начальнік 4-га ўчастка Гродзенскага павета таксама разглядаў справу па абвінавачванні сялян вёскі Агароднікі Лашанской

воласці братоў А. і С. Ярашэвічаў у нанясенні пабояў палявому вартаўніку Г. Чурукевічу [4, арк. 1]. Земскі начальнік на падставе паказанняў сведак і пацярпелага палічыў віну сялян цалкам даказанай і прыгаварыў іх да трох тыдняў турэмнага зняволення [4, арк. 14–15]. Даволі часта земскія начальнікі разглядалі справы аб крадзяжах. Прыкладам з'яўляецца скарга арандатара саду ў маёнтку Адаменкі Лёзненскай воласці Аршанскага павета Магілёўскай губерні Б. Фількінштэйна, які 18 верасня 1914 г. звярнуўся да паліцэйскага ўрадніка Аршанскага павета з заявай аб крадзяжы сялянамі П. і І. Пагадзенкавымі яблыкаў у яго садзе [5, арк. 1–4]. Паліцэйскі ўраднік перадаў справу земскаму начальніку 6-га ўчастка Аршанскага павета [5, арк. 13]. Аднак судовая вытворчасць было адкладзена з-за мабілізацыі абвінавачанага П. Пагадзенкава на ваенную службу [5, арк. 22]. Падобныя прыклады былі характэрныя і для іншых губерняў. У прыватнасці, земскі начальнік разглядаў справу аб крадзяжы з гарбарнага прадпрыемства І. Шапіра. Абвінавачаны ў злачынстве С. Чабан на пасяджэнне не з'явіўся, па чутках ён паехаў на заробкі ў Амерыку [6, арк. 1–5].

У многіх выпадках ўрэгуляванне пазямельнага ўладкавання сялян залежала ад своечасовага вырашэння спрэчных пытанняў земскімі начальнікамі. Аднак бяздзейнасць або халатнасць з іх боку прыводзілі да таго, што працэс пазямельнага ўладкавання расцягваўся на гады. Да прыкладу, землямер Аўгустоўскі (імя невядома) 23 кастрычніка 1905 г. падаў скаргу на земскага начальніка 7-га ўчастка Навагрудскага павета М.А. Полазава. Ён паказаў, што не меў магчымасці зрабіць межавыя дакументы, паколькі многія спрэчкі не былі разабраны земскім начальнікам. Больш таго, ён не прысутнічаў пры размежаванні зямлі. Губернская прысутнасць пяць разоў прадпісвала земскаму начальніку, які ўжо быў пераведзены ў Мазырскі павет, у бліжэйшы час прадставіць звесткі аб размежаванні [2, арк. 23]. Толькі пасля пагрозы адхілення ад пасады М.А. Полазаў адказаў, што перапіска магла згубіцца на пошце ў Баранавічах, дзе ў гэты перыяд з-за забастовак «панаваў хаос» [2, арк. 24]. На пасяджэнні Мінскай губернскай прысутнасці 23 снежня 1908 г. было прынята рашэнне прызнаць дзеянні земскага начальніка неправамернымі і абмежавацца ўжо накладзенай строгай вымовай [2, арк. 27–28]. Наяўнасць у беларускіх губернях такіх перажыткаў, як сервітут і цераспалосіца, таксама прыводзіла да ўзнікнення шматлікіх спрэчак паміж памешчыкамі і сялянамі. Неаднаразова няздольнасць земскіх начальнікаў вырашыць справу мірным шляхам правакавала ўзнікненне новых спрэчак і рост шматлікіх заяў і скаргаў. У той жа час зацяжныя і даўнія канфліктныя сітуацыі паміж памешчыкамі або арандатарамі і сялянамі часта не ўдавалася ўрэгуляваць мірным шляхам. Спробы вырашыць канфлікт з боку земскіх начальнікаў успрымаліся памешчыкамі як саступкі сялянам і абмежаванне іх правоў на зямлю. У прыватнасці, памешчык маёнтка Старыца Ігуменскага павета К. Рэвенскі падаў скаргу на імя губернатара на дзеянні земскага начальніка 7-га ўчастка Ігуменскага павета А. Макіеўскага. Памешчык сцвярджаў, што земскі начальнік патрабаваў ад арандатараў, каб яны самі саступілі свае ўчасткі сялянам і знішчылі арэндныя дагаворы, у адваротным выпадку ўчасткі будуць канфіскаваныя [3, арк. 18]. Па словах памешчыка, падобная дзейнасць земскага начальніка магла прывесці да сялянскіх хваляванняў. Земскі начальнік, у сваю чаргу, паказаў, што сяляне вёскі Яўсеевічы Ігуменскага павета неаднаразова скардзіліся на абмежаванне іх права на выпас жывёлы з боку арандатараў. Для таго, каб завяршыць справу мірнай дамовай, земскі начальнік спрабаваў тлумачыць як арандатарам, так і

сялянам, што яны павінны ісці на саступкі адзін аднаму і дазваляць праганяць жывёлу праз свае ўчасткі. Акрамя таго, А. Макіеўскі патлумачыў арандатарам, што яны не мелі права на выпас жывёлы на пашах, якія прадастаўлены ў выключнае карыстанне сялян [3, арк. 19]. Земскі начальнік паабяцаў сялянам звязацца з памешчыкам па пытанні аб выкупе імі цераспалосных участкаў, а таксама растлумачыў, што Сялянскі банк можа даць ім гэтую магчымасць. Па рашэнні Мінскай губернскай прысутнасці скарга памешчыка ў дачыненні да земскага начальніка была прызнана неабгрунтаванай [3, арк. 41].

Важным аспектам у дзейнасці земскіх начальнікаў у перыяд Першай сусветнай вайны было таксама падтрыманне спакою ў вёсцы і прадухіленне сялянскіх хваляванняў. У прыватнасці, на тэрыторыі Мінскай губерні ў 1914–1915 гг. пашырыліся выпадкі пажараў, што выклікала мноства чутак пра «няўлоўных падпальшчыкаў» [8, арк. 115]. Згодна з цыркулярам Мінскай губернскай прысутнасці земскія начальнікі павінны былі прыняць меры па спыненню пажараў, усталяваць ва ўсіх населеных пунктах губерні начныя і, па магчымасці, дзённыя каравулы і зрабіць пастаянным кантроль па пажарабяспецы [8, арк. 115].

Першая сусветная вайна ўнесла карэктывы ў дзейнасць земскіх начальнікаў і органаў сялянскага кіравання. Па рашэнні ўрада земскія начальнікі павінны былі зрабіць акцэнт на дзейнасці ў сацыяльнай сферы. Яны абавязаны былі вырашаць пытанні, звязаныя з прызначэннем пенсій ваеннаслужачым, якія страцілі працаздольнасць у перыяд баявых дзеянняў, з аказаннем дапамогі бежанцам, забеспячэннем добраўпарадкавання сялянскага побыту ва ўмовах ваеннага часу, эвакуацыяй мірнага насельніцтва і забеспячэннем захаванасці іх маёмасці. Асаблівую актуальнасць напярэдадні Першай сусветнай вайны набыла дзейнасць земскіх начальнікаў па захаванні сацыяльнага спакою і прадухіленню сацыяльных канфліктаў у вёсцы. Гэта тычылася больш хуткага і эфектыўнага ажыццяўлення імі судовай дзейнасці і пазямельнага ўладкавання. Разам з тым, няздольнасць земскіх начальнікаў вырашыць шматлікія канфліктныя сітуацыі прыводзіла да іх абвастрэння і ўзнікнення новых спрэчак і рознагалоссяў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Высочайше утвержденное Положение о земских участковых начальниках : 12 июля 1889 г., № 6196 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3 : в 33 т. – СПб., 1891. – Т. 9. – С. 508–535.

2. Дело по жалобе землемера Новугрудского уезда Августовского на обвинение его земским начальником 7 участка Полозовым на медлительность действий при отграничении крестьянских земель от помещичьих. Выписки о количестве отграниченных надельных земель по 7 участку за 1904, 1905 гг. // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 574.

3. Дело по жалобе помещика им. Старица Игуменского уезда Ревенского на неправильное разъяснение крестьянам их прав на сервитут земским начальником 7 участка Игуменского уезда Мокиевским // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 977.

4. Дело по обвинению крестьян дер. Огородники Лошанской волости Ярошевичей Осипа и Самуила и Шкута Андрея в нанесении побоев полевому сторожу Чурукевичу Герасиму // НИАБ в г. Гродно. – Ф. 512. Оп. 1. Д. 185.

5. Дело по обвинению крестьян Павла и Ильи Алексеевых Погодинковых за воровство у арендатора Боруха Филькинштейна // НИАБ. – Ф. 2817. Оп. 1. Д. 3.

6. Дело по обвинению крестьянина д. Боротынщина Сокольского уезда Чабана Степана в краже подметок с завода Шапиро Исифа // НИАБ в г. Гродно. – Ф. 534. Оп. 1. Д. 56.

7. Дело по обвинению маркизой Велепольской крестьянина Николая Иванова Шевчика по 155 ст. Устава о наказаниях // НИАБ. – Ф. 265. Оп. 1. Д. 36.
8. Циркуляры МВД, Департамента полиции, Минского губернатора и Присутствия // НИАБ. – Ф. 1595. Оп. 1. Д. 3607.

**Тарасенкова Татьяна Ивановна**

*Государственный архив новейшей истории Смоленской области (Смоленск, Россия)*

## ИЗУЧЕНИЕ РОЛИ ВНЕШНИХ ФАКТОРОВ В ПРОЦЕССЕ ОБРАЗОВАНИЯ ССРБ В СОВРЕМЕННОЙ БЕЛОРУССКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ*

Процесс образования Белорусского советского государства – сложный и противоречивый. Он явился результатом взаимодействия комплекса факторов, сложившихся в Советской России и Белоруссии. В современной историографии наметился рост внимания к внешнеполитическим проблемам периода становления белорусской государственности [4; 8, 15; 22].

Завершение Первой мировой войны, ноябрьская революция в Германии, возрождение Польской республики – эти события мировой истории повлияли на становление белорусской государственности, формировавшейся на советской основе. Эту точку зрения разделяют В.А. Круталевич [6, с. 100], А.Н. Резник [16, с. 34–47], П.Т. Петриков [12, с. 71], А.А. Райченок [13, с. 26], А.В. Тихомиров [25, с. 59], Г.Г. Лазько [9, с. 86–89], И.М. Игнатенко [11, с. 66–67], М.П. Костюк [3, с. 219; 5, с. 100], А.Н. Сорокин [19, с. 15].

А.Н. Резник анализирует влияние ноябрьской революции 1918 г. в Германии на провозглашение БССР, признавая его многоплановым, но подчеркивает, что революция оказалась не предпосылкой, а лишь благоприятным фактором для освобождения Белоруссии и провозглашения белорусской государственности [16, с. 34-39, 46–47].

Гораздо больше внимания уделяется провозглашению Польской республики и заявленным ею претензиям на возрождение государства в границах 1772 г. П.Т. Петриков называет это решающим объективным фактором образования БССР [12, с. 71]. Влияние намерений польского руководства о возрождении Польши на процесс образования БССР отмечает А.В. Тихомиров [25, с. 59]. Создание Белорусского государства, по мнению А.А. Райченка, давало возможность поставить мировое сообщество перед фактом существования другого центра консолидации белорусских земель, имеющего на это больше прав, чем Польша [13, с. 26].

Провозглашение Польской республики и дальнейшее неблагоприятное развитие отношений с ней как фактор образования белорусской государственности рассматривают М.П. Костюк [3, с. 219; 5, с. 100], И. М. Игнатенко [11, с. 66–67], Г.Г. Лазько [9, с. 86–89]. А.Н. Сорокин поддерживает позицию исследователей (в частности, В.А. Круталевича), которые считают, что данный фактор – фактор ускорения образования государства [19, с. 15].

*Статья подготовлена при поддержке Минобрнауки России, проект № 33.1419.2017/ПЧ «Мировая славистика в изучении новой и новейшей истории России и Беларуси: концепты славянского единства и самобытного развития в исторической ретроспективе»